Таким образом, деятельность женотделов имела значительные результаты в оказании помощи детям-сиротам и детским домам. Несмотря на ограниченные возможности самих женотделов и делегатских собраний, отсутствие средств, они смогли привлечь внимание общественности к проблемам детей в первые послевоенные годы.

Литература:

1. Государственный архив Витебской области (далее ГАВО). – Ф. 10060-п. – Оп.26. – Д. 70.
2. ГАВО. – Ф.1 0060-п. – Оп.1. – Д. 1195.
3. Национальный архив Республики Беларусь (далее НАРБ). – Ф. 4-п. – Оп. 49. – Д. 8.
4. НАРБ. – Ф. 4-п. – Оп. 49. – Д. 7.

## ПРАФІЛАКТЫЧНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА ПЕРАДУХІЛЕННІ ЗАХВОРВАННЯЎ НА ВОСПУ Ў ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1916 ГОДЗЕ

Хаданёнак В.М.,
аспірант БДУ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Коршук У.К., доктар гіст. навук, прафесар

У гады Першай сусветнай вайны насельніцтва неакупаванай тэрыторыі Беларусі (Віцебская, Магілёўская, частка Мінскай губерні) зазнала на сабе ўсе жахі жыцця ў прыфрантавой зоне. Апроч пастаяннага недахопу прадуктаў харчавання, холаду ў зімовы час, дадаваліся і шматлікія інфекцыйныя захворванні, змагацца з якімі ва ўмовах ваеннага часу было надзвычай складана. Дэталёвы разгляд медыцынскай справы ў гады Першай сусветнай вайны пакуль што адсутнічае ў беларускай гістарыяграфіі. Тым больш не асвятляліся пытанні, звязаныя з супрацьдзеяннем распаўсюджанню інфекцыйных захворванняў, у прыватнасці – воспы. А без падрабязнага аналізу дадзенай праблемы, усё вывучэнне гісторыі Беларусі перыяду Першай сусветнай вайны будзе не поўным. Улічваючы ўсё вышэй абазначанае, мэтай дадзенай работы з’яўляецца – аналіз праводзімых мерапрыемстваў па папярэджванні захворванняў на воспу ў Віцебскай губерні ў 1916 г. Для дасягнення дадзенай мэты аўтар карыстаўся ў асноўным метадам колькаснага аналізу.

21 чэрвеня 1914 г. царом быў зацверджаны закон “Аб устанаўленні палажэння аб папярэджвальным воспапрышчапленні”[1, арк. 9]. Згодна з ім прышчэпкі ад воспы хоць і не сталі абавязковымі, але ж за прафілактыкай захворвання ўстанаўліваўся пільны кантроль. Рэкамендавалася праводзіць першую прышчэпку ад воспы ўсім дзецям, па дасягненні імі 1-го году. Сама працэдура прышчэпкі разглядалася як хірургічная аперацыя і павінна была праводзіцца з усімі асэптычнымі перасцярогамі.

Пачатак баявых дзеянняў прывёў да значнага росту захворванняў на воспу, што асабліва тычылася прыфрантавой паласы. Вялікая колькасць бежанцаў, антысанітарныя ўмовы пражывання, спрыялі найбольш хуткаму распаўсюджванню хваробы.

У Віцебскай губерні напярэдадні Першай сусветнай вайны (звесткі на 1-га студзеня 1914 г.) пражывала 1.953.100 чалавек; у тым ліку ў гарадах – 326.200 чалавек, а ў вёсках – 1.629.900. [2, с. 18-19]. Зразумела, што ва ўмовах ваеннага часу і катастрафічнага недахопу дактароў, прышчэпкі ад воспы рабіць было няма каму. Таму масава пачалі арганізоўваць адмысловыя курсы, з мэтай даць асобам без медыцынскай адукацыі неабходную тэарэтычную і практычную падрыхтоўку для воспапрышчаплення [1, арк. 16]. Дадзеныя курсы арганізоўваліся пераважна прыватнымі асобамі і грамадскімі арганізацыямі. А загадчыкам курсаў мог быць толькі доктар, на практыцы знаёмы з воспапрышчапленнем, які пэўны час займаў пасаду на ўрадавай ці грамадскай службе. У праграму курсаў уваходзіла абавязковае вывучэнне элементарных звестак па гігіене, па працяканню захворвання на натуральную воспу, тэхніка аперацыі воспапрышчаплення. Па заканчэнні курсаў праводзіўся іспыт і выдавалася адмысловае пасведчанне. Яно давала права праводзіць воспапрышчапленне пад наглядам доктара.

Аналізуючы дакументы медыцынскага аддзялення Віцебскага губернскага праўлення за 1916 год, можна бачыць памеры і эфектыўнасць прафілактычнага воспапрышчаплення ў Віцебскай губерні. Пэўную недакладнасць звесткам (што не можа паўплываць на агульныя высновы), дае той факт, што асобныя павятовыя і гарадскія

ўправы прадастаўлялі інфармацыю аб воспапрышчапленні не рэгулярна і не ў поўным аб'ёме. Так за першае паўгоддзе 1916 г. у Віцебскай губерні былі зроблены прышчэпкі ад воспы 29925 чалавекам. З гэтай колькасці дзяцей да 1-го года было – 10161, ад 1да 5 год – 5226, ад 5 да 10 год – 4865, людзей іншага ўзросту – 9676. З агульнай колькасці ўпершыню прышчэпленых вынік быў пракантраляваны ў 13 973 чалавек (у 11806 паспяхова, а ў 2167 – неўдала) [1, арк. 2].

Перыядычна праводзіліся і паўторныя прышчэпкі ад воспы (рэвакцынацыя). Так у межах Віцебскай губерні паўторна былі прышчэплены 23629 чалавек (у 10 190 з іх вынік быў пракантраляваны) [1, арк. 3].

Такім чынам бачна, што папярэджвальнае воспапрышчапленне ў Віцебскай губерні ў 1916 г. не набыло масавага характару ( у першую чаргу з-за недахопу кваліфікаванага медыцынскага персаналу і цяжкасцяў ваеннага часу). Так за першае паўгоддзе 1916 г. у Віцебску было прышчэплена ўсяго толькі 149 чалавек, а ў Полацку - 108 [1, арк. 2]. Усяго ж па губерні за 1916 г. было прышчэплена каля 1,5% насельніцтва. Усё гэта стварала значныя цяжкасці для змагання з распаўсюджваннем хваробы і недапушчэннем перарастання яе ў маштабную эпідэмію.

Літаратура:
1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Фонд 2513. Воп. 2. Справа 1861.
2. Россия, 1913 г. / Рос. АН, ин-т рос. истории. – СПб.: Рус.-Балт. информ. центр "Блиц", 1995. – 416 с.

## ТОРГОВЛЯ ЛЕСОМ МЕЖДУ БЕЛАРУСЬЮ И ГЕРМАНИЕЙ В НАЧАЛЕ XX ВЕКА

Хвасько С.А.,
магистрант УО «ГГУ им. Ф. Скорины», г. Гомель, Республика Беларусь
Научный руководитель – Бабков А.М., кандид. ист. наук, доцент

В российско-германских торгово-экономических связях, интенсивно развивавшихся в начале XX века, значительное место принадлежало лесоторговле. Германский ввозной тариф устанавливал повышенные пошлины на обработанные лесоматериалы, что приводило к увеличению вывоза из России древесного сырья. Немаловажное значение в торговле лесом принадлежало в начале XX века и белорусским губерниям. По составу вывозимых лесоматериалов экспорт Беларуси был еще менее экономичен, чем экспорт всей России; она вывозила за границу 65% круглого леса, 15% тесаного, столько же пиломатериалов и около 5% дров. Подавляющая часть леса из белорусских губерний вывозилась в Германию, вследствие чего ей принадлежала главенствующая роль в экспорте лесоматериалов из Российской империи на германский рынок. Так, в 1913 г. в Германию было вывезено 81 885 тыс. пудов лесоматериалов, что составляло 25,4% общего объема вывозимого Беларусью леса, 64,5% ее экспорта леса за границу и 54,1% общеимперского экспорта леса в Германию [1; С.225]. По данным германской статистики ввоз лесоматериалов из России составил: 1902 г. – 4073 тыс. тонн, 1903г. – 4991, 1904г. – 5349, 1905г. – 5698, 1906 г. – 6932, 1907 г. – 7547, 1908 г. – 6899 тыс. тонн соответственно [2; С.30]. Обращаясь к вопросу о том, каково соотношение между количеством круглого и обработанного леса, ввозимого Россией в Германию, можно привести данные германской статистики за пятилетие с 1904г. по 1908г. (в процентах): 1904г.- 71% круглого леса и 29% обработанного леса, 1905г. – 72% и 28%, 1906г. – 71% и 29%, 1907г. – 68% и 32%, 1908г. – 65% и 35% соответственно [2; С.32]. По германским данным, в 1907г. Россия экспортировала в Германию около 215 731 тыс. пудов различных лесных материалов на сумму до 61 867 тыс. руб., в 1908 г. – 207 419 тыс. пудов на 54 193 тыс. руб. и в 1909г. – 233 462 тыс. пудов [2; С.34]. Обилие водных путей, ведущих непосредственно в Германию, несмотря на их неустроенность в пределах России, создавало благоприятные условия для дешевого транспорта леса. Из общего количества лесных материалов, вывезенных в 1913г. белорусскими губерниями в Германию, 60,5% было отправлено по Неману, 3,6% -